СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Бяроза. Камянец. Дзівак. Паліп. Сопка. Іон. Севан. Алей. Іванава. Сын. Дотык. Тара. Турнік. Іўе. Кібела. Мост. Ром. Рур. Катэт. Лодар. Тар. Танк. Тэраса. Пакос. Полк. Анка. Кобрын. Атаманка. **Па вертыкалі:** Гарманіст. Маларыта. Стаер. Нітрат. Праліў. Ура. Орда. Кедр. Пасад. Клапан. Асіна. Кон. Левіт. Столка. Крагі. Скат. Пінск. Кат. Зіма. Нант. Аперэта. Фетр. Лотас. Атам. Разетка.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

СКАРПІЁНАМ ЛЕПШ НЕ ГНАЦЦА ЗА ДОЎГІМ РУБЛЁМ, А СТРАЛЬЦЫ МОГУЦЬ РАЗЛІЧВАЦЬ ТОЛЬКІ НА ЎЛАСНЫЯ СІЛЫ

АВЕН. Паспрабуйце быць больш прадбачлівымі — гэта дапаможа падрыхтавацца да раптоўнай змены сітуацыі. З некаторымі партнёрамі будзе складана дамовіцца, таму верагодны зрыў перамоў. Не перагружайце сябе працай у пятніцу. Паспрабуйце не ўвязвацца ні ў якія аферы, асабліва ў канцы тыдня.

ЦЯЛЕЦ. На працы справы будуць ісці добра. Магчыма заключэнне ўдалых кантактаў з замежнымі (або іншагароднімі) партнёрамі, а таксама далёкія паездкі, камандзіроўкі, падпісанне новых дамоў. Абараніце сябе ад непатрэбных сустрэч, бо яны могуць неспрыяльна адбіцца на вашай энергетыцы.

БЛІЗНЯТЫ. На працы могуць паўстаць дробныя непрыемнасці, якія, на жаль, займаюць шмат часу на вырашэнне. Гэта вынік няўпэўненасці ва ўласных сілах і ўменнях. Дэманстрацыя самакрытычнасці прывядзе да таго, што вам сядуць на шыю, даўшы зразумець, што вы дрэнна спраўляецеся з абавязкамі.

РАК. Нягледзячы на намаганні з боку некаторых «прыязнікаў», у вашых сілах захаваць добрыя адносіны з партнёрамі і калегамі. Вашы асабістыя планы будуць часткова не супадаць з планамі сваякоў, таму давядзецца іх узгадняць. Актыўнасць і мэтанакіраванасць дазволяць з лёгкасцю вырашаць праблемы на працы. У вас атрымаецца адагрэць сэрцы і душы навакольных мудрымі і рашучымі ўчынкамі, увагай.

ЛЕЎ. Жыццёвыя падзеі стануць вельмі разнастайнымі, магчымыя цікавыя знаёмствы і навіны ад сяброў. Пачынаючы з аўторка вы адчуеце прыліў энергіі і пры некаторым жаданні зможаце лёгка апынуцца на вяршыні поспеху. Ваша актыўнасць будзе асабліва прыкметная на фоне ўсеагульнай бяздзейнасці. Пасля працоўных подзвігаў дазвольце сабе адпачыць.

ДЗЕВА. Паспрабуйце разгадаць некалькі загадак, якія вам паднясе лёс, — і вы не пашкадуеце аб выдаткаваным часе. Выбірайце аб'ём працы суадносна сваім сілам, але пры гэтым не адмаўляйцеся ад дапамогі сяброў. Магчымая не зусім прыемная гутарка з начальнікам, якая скончыцца пэўным рашэннем. Не дазваляйце трывожным думкам завалодаць розумам — зоркі не пакінуць вас без заступніцтва. У пятніцу і суботу не мінуйце міма важнай інфармацыі, яна можа падказаць вам узрушальную ідэю.

ШАЛІ. Актыўная працоўная дзейнасць можа запатрабаваць ад вас дадатковых намаганняў. Таму імкніцеся не ўзвальваць на свае плечы загадзя непасільны груз. Калі ж, наадварот, нагрузка падасца вам недастатковай — паспрабуйце накіраваць энергію ў рэчышча мірных сямейных спраў. Не варта абвальваць свой праведны гнеў на родных, іх паводзіны — гэта ўсяго толькі рэакцыя на ваша да іх стаўленне.

СКАРПІЁН. Усё ў вас будзе атрымлівацца, напрацоўкі ўхваліць начальства, тым самым вы палепшыце адносіны з ім, а таксама з калегамі. Пашырыцца кола зносін, з'явяцца новыя партнёры і фундатары. Дарэчы, калі вы надумалі змяніць працу, то дзейнічайце па вызначаным плане, але не ганіцеся за доўгім рублём: тут вас, хутчэй за ўсё, чакае няўдача. Для дасягнення вынікаў давядзецца папрацаваць трохі больш, чым звычайна.

СТРАЛЕЦ. Разлічвайце толькі на свае сілы. На гэтым тыдні давядзецца з галавой акунуцца ў паўсядзённыя справы. Прыслухайцеся да парад сяброў. У сярэдзіне тыдня верагодныя паездкі або заключэнне дамоў. Ёсць перспектыва ўдалага і выгаднага знаёмства. Можа з'явіцца магчымасць зарабіць, чакаюцца слушныя прапановы з боку начальства. Паспрабуйце зрабіць так, каб сітуацыя, якая склалася, была вам на карысць.

КАЗЯРОГ. Каб не страціць узятага тэмпу, паспрабуйце крытычна аналізаваць прапановы і інфармацыю, якія паступаюць. У адваротным выпадку, справы, якія так добра ішлі па накатаным шляху, могуць раптам застопарыцца з-за непрадуманага дзеяння. З'явіцца схільнасць упадаць у недарэчныя крыўды на навакольных, прычым на пустым месцы.

ВАДАЛЕЙ. Выразна сфармулюйце, чаго вам хочацца, і спакойна плывіце па цячэнні: усё паступова само ўладкуецца менавіта так, як вам трэба. Сціпласць будзе годным упрыгожваннем — не забывайцеся пра гэта, і шмат магчымых непаразуменняў і нават канфліктных сітуацый абміне вас. Але не сыходзьце ў цень назусім: свае правы ўсё ж можна і трэба адстойваць, галоўнае — знайсці дзейсныя аргументы.

РЫБЫ. Тыдзень можа аказацца актыўным і плённым, але толькі пры ўмове, што вы не будзеце парушаць закон, а ў апошнія два дні праявіце цярпенне і разуменне ў стаўленні да блізкіх людзей. Вам проста неабходна ўлавіць важную ідэю ў сярэдзіне тыдня, якая як па ўзмаху чарадзейнай палачкі пашырыць вашы магчымасці. Пятніца можа аказацца самым спрыяльным днём для сур'ёзных распачынанняў у калектыве.

Zамор'е

Падрыхтаваў Іван КУПАРВАС.

МАСАЖ З ДАПАМОГАЙ... ЗМЕЙ

У большасці курортаў ёсць назвы, якія выклікаюць у думках атмасферу шчасця і спакою. А вось спа-салон у невялікім пасёлку Талмей Элазар на поўначы Ізраіля носіць адмысловую назву «Ферма драпежных раслін». І прапаноўвае не зусім звычайныя працэдуры. Наведаць гэты незвычайны спа-салон адважыцца не кожны: ва ўстанове масажыстамі працуюць жывыя рэптыліі.

Тут турыстам прапаноўваюць вось такую прыемную і «страшную» працэдуру. Для масажу выкарыстоўваюць неядавітых каралеўскіх змей родам з Каліфорніі і Фларыды, а таксама плямістых і малочных гадаў. Тут можна расслабіцца і атрымаць ад працэдуры максімум задавальнення. Працэдуру прыдумала Ада Барак, гаспадыня мясцовай «Фермы драпежных раслін» і па сумяшчальніцтве спа-курорта. Гэтае месца стала асноўнай славутасцю пасёлка. Маючы зносіны з турыстамі, Ада заўсёды давала ім дакрануцца да неядавітых змей, якія жылі ў аранжарэі, і выпадкова выявіла ад гэтага тэрапеўтычны эфект. Як адзначыла гаспадыня ўстановы, здольнасць змей здымаць стрэс вядомая спрадвеку, так што ў яе ідэі няма практычна нічога новага. Тып масажу залежыць ад даўжыні змей: больш буйныя (напрыклад, каралеўская змяя і плямісты лазаючы полаз) здымаюць боль у мышцах спіны, а гады сярэдніх памераў выклікаюць эфект агульнага расслаблення і ствараюць прыемную вібрацыю. Пасля таго, як Адай быў адкрыты новы спосаб змяінага масажу, на ферму сталі прыбываць аматары вострых адчуванняў усіх узростаў. Масаж нагадвае сеанс шокавай тэрапіі: калі масажыст апускае на жывот кліенту адразу некалькі змей, жаданне залямантаваць і ўцячы становіцца практычна непераадольным. Аднак неўзабаве ўсё змяняецца. 5—6 змей, якія адчуваюць сябе не надта ўтульна на целе чалавека, паўзуць кожная ў свой бок. Дасведчаны масажыст вяртае «лекараў» прахалоднай і гладкай скурай на месца, заблытваючы іх так, каб яны даўжэй заставаліся прахалодным клубком. Доктар Нава Бешэр, якая праводзіць сеансы такой тэрапіі, сцвярджае, што змяя нездарма лічыцца знакам медыцыны. Экстрэмалы, якія заехалі да Ады Барак, сцвярджаюць, што дакрананне змей спрыяе поўнай рэлаксацыі.

ВОСЬ ГЭТА ДНІ НАРОДЗІНАЎ!

МІЧЫГАНСКАЯ хатняя гаспадыня святкуе нараджэнне сваёй дачкі Керы 10.10.10. Прычым гэтая дата ідзе за датамі нараджэння яе сына (09.09.09) і яе першай дачкі (08.08.08). Як сведчыць статыстыка, гэты выпадак адзін на 50 мільёнаў!

36-гадовая амерыканка Барбара Сопер кажа, што гэта іх уласны невялікі цуд. Нягледзячы на ўнікальнасць дат дзіцячых дзён нараджэння, Соперы настойваюць, што гэта не было запланавана і яны нават хваляваліся з гэтай нагоды. Першае дзіця пары з'явілася на свет якраз у дзень заканчэння тэрміну. Другое дзіця нарадзілася раней за тэрмін (як меркавалася, гэта было 20 верасня) з дапамогай медыцынскага ўмяшання. Апошняе дзіця нарадзілася таксама раней за тэрмін (4 лістапада), бо доктар Барбары хацеў прадухіліць патэнцыйныя ўскладненні.

СОНЦА Ў ТАБЛЕТКАХ

У Францыі ў продаж паступіў арыгінальны прэпарат, які ўяўляе сабой сонца ў таблетках — не ў пераносным сэнсе, а прамым.

Ён уяўляе сабой капсулы, а ў іх — святло сонца з Бора-Бора і экзатычных Багамскіх і Мальдыўскіх астравоў. Да таблетак прыкладаецца інструкцыя. А ў ёй напісана, што святло, якое ёсць у цуда-таблетках, здольнае вылечыць ад прыкмет дэпрэсіі і стрэсу. Акрамя таго, у ёй указаны тэрмін ужывання і дозы прэпарата.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.52	17.55	9.03
Віцебск —	8.46	17.41	8.55
Магілёў —	8.42	17.45	9.03
Гомель —	8.34	17.47	9.13
Гродна —	9.07	18.11	9.04
Брэст —	9.02	18.17	9.15

Месяц

Поўня 7 лютага.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Гаўрылы, Георгія, Івана, Макара, Мікалая, Пятра, Цімафея, Якава.*

К. *Веранікі, Андрэя, Юзафа.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



4 лютага

Дзве даты

Міжнародны дзень барацьбы супраць раку. Праводзіцца Міжнародным саюзам па барацьбе з анкалагічнымі захворваннямі пры падтрымцы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

1887 год — нарадзіўся Фабіян Шантыр, беларускі пісьменнік і публіцыст, грамадскі дзеяч. За ўдзел у рэвалюцыйных падзеях зняволены ў Слуцкай турме ў 1905—1907 гадах.У 1919 годзе быў камісарам па нацыянальных справах Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі. Друкаваўся з 1909 года ў газеце «Наша ніва». Аўтар апавяданняў «Захар», «Ноч», «Пад шум лесу» і іншых. Памёр у 1920 г.

1945 год — у Лівадыйскім палацы каля Ялты адкрылася Крымская канферэнцыя кіраўнікоў трох саюзных дзяржаў антыгітлераўскай кааліцыі — старшыні Саўнаркама СССР Сталіна, прэзідэнта ЗША Рузвельта і прэм'ер-міністра Вялікабрытаніі Чэрчыля. Да гэтага часу, у выніку наступлення Савецкай арміі і высадкі саюзных войскаў у Нармандыі, ваенныя дзеянні ўжо былі перанесеныя на германскую тэрыторыю. Вайна супраць фашысцкай Германіі ўступіла ў завяршальную стадыю. На канферэнцыі былі ўзгодненыя планы канчатковага разгрому ворага, вызначаны адносіны да Германіі пасля яе безумоўнай капітуляцыі, намечаны асноўныя прынцыпы ўсталявання пасляваеннага свету. Таксама было прынята рашэнне правесці ў красавіку 1945 года ўстаноўчую канферэнцыю Арганізацыі Аб'яднаных нацый. Акрамя таго, СССР выказаў згоду ўступіць у вайну супраць Японіі праз 2-3 месяцы пасля заканчэння вайны ў Еўропе. За гэтую згоду савецкі лідар запатрабаваў нямала: захавання статус-кво Мангольскай Народнай Рэспублікі, падзелу Карэі на дзве зоны па 38-й паралелі, вяртання Савецкаму Саюзу паўднёвай часткі Сахаліна з прылеглымі астравамі, перадачы Курыл і аднаўлення дамовы аб арэндзе Порт-Артура. Рашэнні Ялцінскай канферэнцыі шмат у чым вызначылі пасляваеннае ўстройства Еўропы і свету амаль на 50 гадоў, аж да крушэння сацыялістычнай сістэмы ў пачатку 90-х.

Цытата дня:

«Няўжо вам неахвота прыслухацца да ісціны старой, што неспакой не лечыць адзінота, што адзіноту лечыць неспакой».

Аркадзь Куляшоў (1914—1978), беларускі паэт.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

Карэйская салата з курыных страўнікаў з рэдзькай

Спатрэбіцца: ***страўнікі курыныя — 0,5 кг, цыбуля рэпчатая — 1 шт., рэдзька — 1 шт., алей (для смажання), воцат (9%), соль, перац чорны молаты, папрыка, соевы соус — 1 ст. л., цукар — 1 ч. л. (без горкі).***

Курыныя страўнікі добра прамыць, нарэзаць саломкай, пасаліць, паперчыць, дадаць воцат і пакінуць марынавацца на 0,5—1 гадзінку. Пакуль марынуюцца страўнікі, парэжце цыбулю паўкольцамі і замарынуйце яе ў воцатным растворы. У міску пакладзіце цыбулю, заліце цёплай гатаванай вадой і дадайце воцату, каб вада была кіславатая. Рэдзьку трэба пачысціць, надзерці на буйной тарцы. У патэльню наліваем алей, кладзём страўнікі разам з сокам і тушым іх на сярэднім агні пад накрыўкай. Калі ўвесь сок выпарыцца, яшчэ трохі абсмажваем. Перасмажваць не трэба, а то страўнічкі будуць сухаватыя. Змешваем смажаныя страўнікі, рэдзьку і марынаваную цыбулю. Дадаём сталовую лыжку соевага соусу, цукар, калі воцату замала на смак, можаце яшчэ капнуць некалькі кропель, падсаліць і паперчыць. Заправіць алеем.

Рыбныя «цукеркі»

Спатрэбіцца: ***рыба, морква, лук рэпчаты, маянэз, соль, перац.***

Рэжам на кавалачкі рыбу, марынуем у маянэзе з дабаўленнем солі і перцу. Пакуль рыбка марынуецца, смажым моркву з цыбуляй. Яшчэ па жаданні можна дадаць грыбы. На кавалкі фольгі ўкладваем рыбу і падсмажаную моркву з цыбуляй. Заварочваем нашу цукерку. Адпраўляем у духоўку на 15-20 хвілін. Падаваць да стала можна як гарачымі, так і халоднымі. Рыбка атрымліваецца сакавітая і вельмі смачная. Але памятайце: разгортваць рыбныя «цукеркі» трэба акуратна.

ЗДАРОЎЕ НА ТАЛЕРЦЫ

Сезон сухафруктаў

Сама назва гаворыць пра тое, што гэта тыя ж самыя фрукты, толькі без вады. Яны страцілі частку карысных рэчываў (напрыклад, вітаміны С і А), а вось натрый, магній і клятчатка засталіся. Між іншым, калі фрукт высах, то канцэнтрацыя гэтых мікраэлементаў прыкметна павялічылася (трэба памятаць што сухафрукты значна больш каларыйныя, чым свежыя фрукты).

Сухафрукты з'яўляюцца выдатным дапаўненнем да многіх страў, насычаючы іх энергіяй і карыснымі рэчывамі.

Папая карысная для імунітэту, бялковага абмену і сэксуальнай актыўнасці.

Чарнасліў утрымлівае вялікую колькасць вітаміну В. Гэты сухафрукт дапамагае рабоце кішэчніка.

Інжыр важны для шчытападобнай залозы, ён прадухіляе развіццё ракавых клетак.

Курага ўтрымлівае шмат калію, жалеза, караціну. Дапамагае пры запорах.

Фінікі ўтрымліваюць вітаміны Е і Н, вельмі важныя для канцэнтрацыі ўвагі.

-2822-

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

Ваза з бляшанак

Бляшанкі з-пад піва або іншых напояў можна выкарыстаць як арыгінальную вазу.

Для гэтага цотную колькасць бляшанак — лепш 6 або 8 — трэба склеіць разам, каб яны ўтварылі прастакутнік (звычайнае размяшчэнне бляшанак ва ўпакоўцы). Зрабіць гэта можна з дапамогай звычайнага ўніверсальнага клею альбо паклаўшы наверх слоікаў адмысловую пласцінку. Пласцінку выразаем з тонкага пластыку з дапамогай разака, у якасці трафарэта выкарыстоўваем тыя ж бляшанкі. Сама па сабе такая ваза выглядае не вельмі прывабна, але калі ўставіць у кожную бляшанку па кветцы — атрымаецца сапраўдная прыгажосць.

ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ

Як даглядаць клавіятуру

Сучасны свет без камп'ютара практычна не абыходзіцца. А любы камп'ютар мае клавіятуру. Тыя, хто «юзае» клавіятуру па поўнай праграме, выдатна ведаюць, як яна забруджваецца. Неабходны догляд і рэгулярная чыстка клавіятуры.

Правіла 1.

Для клавіятуры, кнопкі якой пры націску апускаюцца ў адведзеную ім ячэйку, варта захоўваць правіла: не есці ніякія прадукты на сваім працоўным месцы за камп'ютарам. Выпадкова можна разліць на клавіятуру чай, каву або рассыпаць хлебныя крошкі або чыпсы, засмеціўшы клавіятурныя ячэйкі. Клавіятура можа быць загубленая цалкам, або ёй давядзецца прайсці капітальны рамонт і чыстку.

Правіла 2.

Самы просты догляд клавіятуры — гэта штотыднёвае праціранне адмысловымі сурвэткамі для камп'ютара. Такія сурвэткі насычаныя вадкасцю, якая чысціць тлушчавыя і пылавыя забруджванні з усіх дэталяў камп'ютара. Калі ў вас сэнсарная клавіятура — то гэта адзінае, што вам спатрэбіцца з ёй рабіць. Калі ў вас клавіятура з механічнымі кнопкамі, то патрэбен іншы падыход.

Правіла 3.

Для таго, каб сабраць з клавіятуры крошкі і пыл, можна выкарыстаць USB-пыласос для клавіятуры. Гэта мініятурны пыласос з USB-раздымам, мае магчымасць падлучыцца непасрэдна да камп'ютара. Да маленькага пыласоса дадаюцца насадкі-шчоткі, якія дапамогуць вычысціць з закуткаў клавіятуры ўсе крошкі і пылінкі. USB-пыласосы маюць невялікую магутнасць, але тым не менш са сваёй задачай спраўляюцца.

Правіла 4.

Ёсць яшчэ спосаб хутка пачысціць клавіятуру. Спачатку пераварочваем клавіятуру ніжнім бокам угору і акуратна трасем яе. Убачыце, як з усякіх зазораў пасыплюцца запасы крошак і варсінак. Затым скарыстаем скотч. Ліпкі бок скотчу прыляпляем да забруджаных участкаў, і да яго прыліпае нават тлустая гразь. Скотч трэба прыляпіць шчыльна, але не надоўга, каб не пакінуць клейкія сляды. Гэты спосаб не лепшы, але для экспрэс-чысткі падыдзе.

-2823-

Усміхнемся

Хутчэй бы 23 лютага, а то пена для галення заканчваецца і шкарпэтак цэлых засталося мала...

Жанчына заходзіць у дзяжурную часць міліцыі.
— Скажыце, ці магу я напісаць заяву аб знікненні мужа?
— А муж даўно дадому не з'яўляўся?
— Амаль чатыры тыдні.
— А чаму вы толькі цяпер спахапіліся?
— Яму хутка заробак атрымліваць, вось і пачала трохі хвалявацца.

З тлумачальнай настаўніка фізкультуры:
«...Затое ён зараз ведае, дзе знаходзіцца печань».

— Колькі адцісканняў можа зрабіць Чак Норыс?
— Усе.

Мужчыны толькі робяць выгляд, што не разумеюць жанчын. Ім гэта абыходзіцца танней.



Віншуем **Марыю Каленікаўну КАСАЧ** з в. Дзятлавічы Лунінецкага раёна!
С днем рождения тебя поздравляем,
самый близкий, родной человек,
сибирского здоровья тебе мы желаем
не на год, а на долгий твой век!
Пусть здоровье твое будет крепким,
сердце вечно молодым,
пусть каждый день твой будет светлым
на радость нам и всем родным!
З любоўю муж, дзве дачкі, два зяці, дзве ўнучкі і два ўнукі і ўся наша радня.

Дарагая мамачка, свякроў, пляменніца, бабуля, суседка, сяброўка, проста шчырая добразычлівая і шаноўная **Валянціна Пятроўна ВІНЧЭЎСКАЯ** са Слуцка!
У дзень юбілею з дня нараджэння прыміце нашы сардэчныя віншаванні! Зычым здароўя, жыццёвага аптымізму, павагі і ўдзячнасці ад родных і блізкіх Вам людзей!
З павагай родныя, суседкі, сяброўкі Ісовіч, Машчанка, Новік.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 545. Нумар падпісаны ў 19.30 3 лютага 2012 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12